Язэп Пушча

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сапраўднае імя Іосіф Плашчынскі.
Нарадзіўся 7(20) траўня 1902 г. ў вёсцы Каралішчавічы Менскага павету, Менскае губерні (цяпер Менскі раён) у сялянскай сям'і.

Бацькі, Павел Вікенцьевіч і Міхаліна Вікенцьеўна Плашчынскія, былі непісьменнымі. Жылі ў клопаце пра гаспадарку, пра тое, каб пракарміць і паставіць на ногі шасцёра дзяцей – чатырох хлопчыкаў і дзвюх дзяўчынак. Сям'я была дружная.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Хата Язэпа пушчы ў Каралішчавічах

РЕПОЗІТОРЫЙ БГПУ

Будучы паэт вучыўся ў Каралішкавіцкім народным вучылішчы (1910–1913), у жніўні 1915 быў залічаны вучнем 2-га класа Менскага вышэйшага пачатковага вучылішча.

1918 - жнівень 1921 вучыўся ў Мінскім рэальным вучылішчы.

1921-1922 — слухач курсаў беларусазнаўства Наркамасветы БССР. 1921-26 працаваў настаўнікам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У 1923 быў адным з заснавальнікаў літаратурнага аб'яднання «Маладняк», пазней — «Узвышша»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Рэдкалегія часопіса «Узвышша»: Язэп Пушча стаіць справа. Менск 1927 год.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратурнае аб’яднанне «Узвышша». Язэп Пушча ў першым шэрагу злева.

Скончыўшы рэальнае вучылішча, Язэп Плашчынскі вучыўся на дзевяцімесячных курсах беларусазнаўства Наркамасветы БССР (1921–1922).
1925–1927 вучыўся на пэдфаку БДУ.
Увосень 1927 перавёўся ў Ленінградскі універсітэт , але на чацвёртым курсе пакінуў вучобу.
У 1929 вярнуўся ў Менск, працаваў стыльрэдактарам у “Белдзяржвыдавецтве”.
25 ліпеня 1930 г. па ілжывым абвінавачванні як член міфічнага «Саюза вызвалення Беларусі» быў асуджаны на 5 гадоў высылкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Быў жанаты, гадаваў дваіх дзяцей.

Жонка Язэпа Пушчы
Станіслава Эдуардаўна. 1943 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З жонкай Станіславай Эдуардаўнай,
в. Чаадаева. Лета 1957 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У пэрыяд блукання па пакутах Я. Пушча працаваў бухгалтарам у г. Шадрынску на Урале (1931–1935), восем месяцаў (1935–1936) у саўгасе «Джэмтэ» каля Анапы.

1937–1941 загадчык навучальнай часткі, дырэктар Манакоўскай сярэдняй школы Мурамскага раёну, Уладзімірскай вобласці.

У пачатку вайны ён быў мабілізаваны ў армію, вучыўся ў 2-ім Маскоўскім пяхотным вучылішчы. Пасля вайны працаваў настаўнікам, дырэктарам Чаадаеўскай сярэдняй школы Мурамскага раёна.

З 1955 па 1956 наведаў Беларусь.

19 ліпеня 1958 з сям'ёй вярнуўся ў Менск, дзе жыў да апошніх дзён.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Памёр Язэп Пушча 14 верасня 1964 года. Быў пахаваны ў Каралішчавічах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Творчасць Іосіфа Плашчынскага

Дэбютаваў апавяданнем пад псеўданімам Лясун (1922).

На працягу 1925—1930 выдаў некалькі паэтычных кніг. Вядомасць мелі яго «Лісты да сабакі».

Да высылкі выйшлі зборнікі вершаў «Раніца рыкае» (1925), «Vita» (1926), «Дні вясны» (1927), «Песні на руінах» (1929), а таксама паэмы «Песня вайны» (1928) і «Цень Консула» (першапачатковая назва «Песня акупацыі»), прасякнутыя ўражаннямі аб Першай сусветнай вайне, а таксама паэма «Крывавы плакат» (1930). Была падрыхтавана да выдання кніга «Мой маніфест» (схаваная ў вуллі, а затым, пасля арышту брата, спаленая сястрой Лёдзяй). Быў падрыхтаваны да друку, але не выйшаў зборнік лірыкі «Грэшная кніга».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Аўтабіяграфія
Пляшчынскага Язэпа Паўлавіча (Язэпа Пушчы). 5

Радзіўся 7 мая 1902 года ў вёсцы Караліштавічы, Мінскага р-на, ў сялянскай сям'і. Вучыўся ў Караліштаўскай пачатковай школе, якую скончыў у 1913 годзе. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Мінскім рэальным вучылішчы, якое скончыў у 1920 годзе.

Пасля вызвалення Беларусі ад белапалякаў, з адразу ўключыўся ў савецкае будаўніцтва, пачынаю з 1 верасня 1920 г. працаваць настаўнікам у Караліштаўскай пачатковай школе. У жніўні 1921 года пасылаюць вучыцца на дзевяцімесячныя педагагічныя курсы пры Наркамаветве БССР, якія і скончыў у красавіку 1922 года. З 1922 па 1925 год працую спачатку інспектарам Мазырскага і Мінскага УАНА, а пазней настаўнікам беларускай мовы і літаратуры на агульна-адукацыйных курсах у Мінску і ў Мінскім музычным тэхнікуме.

У 1922 годзе з'яўляюцца ў друку мае першыя вершы. Быў адным з заснавальнікаў „Маладніка" і „Узвышша". У 20-я гады мае вершы друкаваліся ў часопісах „Маладнік", „Полымя" і „Узвышша", у зтыя ж гады выйшлі мае зборнікі вершаў і паэм: „Раніцою рукае" (1925 г.) „Vita" (1926), „Дні вясны" (1927 г.), „Песні на руінах" (1929 г.), „Крывавы плакаў" (1930 г.)

З 1925 па 1930 г. вучыўся ў Беларускім і Ленінградскім дзяржаўных універсытэтах.

У 1930 годзе працаваў стылістычным рэдактарам у Беларускім дзяржаўным выдавецтве.

З 24 ліпеня 1930 г. на некаторы час спыняецца мая літаратурная дзейнасць.

З жніўня 1931 г. па кастрычнік 1935 г. працаваў у Шадрынску ў райлесгасе, ў канторы „Нарпит" бухгалтарам.

У 1936 годзе быў адзначаны на ніве настаўніцкую працу, на якой працую і да гэтага часу. Апошнія дваццаць гадоў дырэктарам сярэдняй школы.

З 1956 г. зноў пачаў друкавацца, як і раней, пад псеўданімам Язэп Пушча.

Я. Пляшчынскі

10 красавіка 1958 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аўтабіяграфія, напісаная ўласнаручна Язэпам Пушчам. 10 красавіка 1958 года.